Начальная школа. Беларуская мова. Тэма «Назоўнік». 4 клас

## Тэст

1.Назоўнікі – гэта словы, якія абазначаюць:

а) прадметы; б) прыметы прадметаў; в) дзеянні прадметаў.

2. Адзначце знакам "+" назоўнікі:

а) мяцеліца; б) бярозавы; в) спіць.

3. Адзначце знакам "+" назоўнікі жаночага роду:

а) герой; б) святло; в) вясёлка.

4. Адзначце знакам "+" назоўнікі мужчынскага роду:

а) медаль; б) зала; в) гусь.

5. Адзначце назоўнікі, якія маюць форму толькі множнага ліку:

а) вароты; б) дрэвы; в) палі.

6. Адзначце назоўнікі, якія маюць форму толькі адзіночнага ліку:

а) пенал; б) яблык; в) паліто.

7. Адзначце слупок, у якім склон адпавядае склону дадзеных назоўнікаў:

| | а) | б) |
|---|---|---|
| у казцы | Т.с. | М.с. |
| ад расы | В.с. | Р.с. |
| святлом | М.с. | Т.с. |

8. Адзначце словазлучэнні, у якіх назоўнікі ўжыты ў творным склоне:

а) пакрылася травой; б) пабялела ад расы; в) нагадвае мора.

9.Якім членам сказа з'яўляецца выдзеленае слова?

Пазіраюць на сонца блакітнымі вочкамі **кветкі**.

а) выказнікам; б) дзейнікам; в) даданым членам.

10.Адзначце сказ, у якім правільна падкрэслены галоўныя члены.

а) Зямлю грэе веснавое сонейка. б)Зямлю грэе веснавое сонейка.

в) Зямлю грэе веснавое сонейка.

Адказы. 1а), 2а), 3в), 4а), 5а), 6в), 7б), 8а), 9б), 10б).